прэс-рэліз

Выбітны польскі джазавы піяніст **АРТУР ДУТКЕВІЧ** прыязджае ў Беларусь з дзвюма рознымі праграмамі, якія ў складзе свайго трыа прадставіць на розных сцэнах краіны:

- **22 кастрычніка**, *Вялікая канцэртная зала Белдзяржфілармоніі (пр. Незалежнасці, 50)*

  **ARTUR DUTKIEWICZ TRIO з прэзентацыяй новага альбома *„ PRANA”;***
- **23 кастрычніка**, *Васілішкаўскі цэнтр культуры і вольнага часу (в. Васілішкі, Шчучынскі раён, Гродзенская вобл.)*

  **ARTUR DUTKIEWICZ TRIO з праграмай “НЕМЭН-ІМПРАВІЗАЦЫІ”.**



*Фота – Радэк Сьвёнткоўскі*

**У Мінску джазмэн прадставіць праграму свайго апошняга альбома PRANA.**

*„Prana” Артура Дуткевіча мае аздараўляльную моц, пазітыўна настаўляе да свету, нясе радасць жыцця, заахвочвае да дзеяння. Каб выклікаць хвалі станоўчых эмоцый хопіць усяго дзесяці хвілін і нашай ўражлівасці. Жыватворная энергія пераўтварылася ў джазавае трыа. Гэта музыка западзе нам у памяць, зробіць залежнымі. Будзем да яе вяртацца, каб набрацца новых сіл. На кожны дзень, кожны выклік.* (**Марэк Душа, *газета “Rzeczpospolita”***)

На сцэне Белдзяржфілармоніі джазмэн выступіць з музыкамі, якія прынялі ўдзел у запісе альбома і з якімі піяніст гастралюе па ўсім свеце на працягу апошніх трох гадоў: кантрабасіст Міхал Бараньскі і барабаншчык Лукаш Жыта.
Тытульная кампазіцыя "Прана" ў перакладзе з санскрыту (найстарэйшай мовы свету) – гэта “сіла”, “энергія жыцця”, якая выяўляецца праз энтузіязм, радасць і творчасць.
Творы Артура Дуткевіча - гэта славянскі лірызм (“*Польская Мазурка*”), рытм і імправізацыйная ідыёма сучаснага джаза *(“Прана”),* а таксама спакой і медытатыўнасць (“*Om Namo Bagawate*”).
Кампазіцыя “*Wójek Tomek*” (*„Дзядзька Томэк”),* якая спасылаецца да блюзавых каранёў джаза, прысвечана памяці легендарнага саксафаніста Томаш Шукальскага, з якім піяніст выступаў на працягу многіх гадоў.
Прэм’ера альбома адбылася ў снежні 2013 г. на фестывалі Jazz Juniors Festival у Кракаве. Канцэрт з захапленнем быў успрыняты слухачамі і быў прызнаны найбольш цікавай падзеяй фестывалю.
Прэм’ерныя канцэрты альбома адбыліся ў Варшаве ў лютым 2014 г.

***



*Фота – Павел Карноўскі*

**Праграму альбома “НЕМЭН-ІМПРАВІЗАЦЫІ” Артур Дуткевіч прэзентаваў у Мінску ў 2011 годзе і ўжо тады марыў выступіць з ёй на радзіме легендарнага Чэслава Немэна.**
**Сёлета мара ажыццяўляецца – Трыа Артура Дуткевіча выступіць на сцэне Васілішкаўскага Цэнтра культуры і вольнага часу з праграмай джазавых імправізацый на творы Чэслава Немэна. Канцэрт прысвячаецца памяці музыкі (сёлета адзначаецца 75 гадавіна нараджэння і 10 гадавіна смерці Чэслава Немэна).**

*Гэта цудоўна, што незабыўны спявак, музыкант і кампазітар знайшоў у асобе Артура Дуткевіча інтэрпрэтатара, які здолеў пад яго гукамі стварыць свой выразны размашысты подпіс.*
*Гэтая музыка ўзносіць слухача, захапляе яго і ўзрушвае.* ( **Кшыштаф Маслань, *газета “Rzeczpospolita”***)

прэс-рэліз

Творчасць Чэслава Немэна здаўна з'яўлялася натхненнем для Артура Дуткевіча. У 2009 г. быў запісаны альбом пад назвай “Немэн – Імправізацыі”. Тым самым падкрэслівалася, наколькі ўніверсальнай з’яўляецца гэтая музыка. Яе з поспехам можна выконваць у джазавым трыа, нават на такіх акустычных інструментах, як раяль альбо кантрабас. У канцэрце прагучаць джазавыя імправізыцыі, зыходным пунктам для якіх сталі творы з рэпертуару легендарнага Чэслава Немэна. У альбом увайшлі такія хіты, як “Сон пра Варшаву”, “Пад Папугаямі”, “Успаміны”, “Жалобная рапсодыя памяці Бэма”, “Аднаго сэрца”, “Ці яшчэ мяне памятаеш”, “Гульня ў жмуркі” і інш.



***Фота – Юзэф Возьняк***

**Артур Дуткевіч**

Адзін з самых выдатных польскіх джазавых піяністаў. Фіналіст прэстыжнага конкурса Тэло́ніуса Монка ў Вашынгтоне. Як першы польскі піяніст выканаў свой сольны канцэрт на Міжнароднай выставе музычнай прадукцыі MIDEM у Канах. Выступаў з выдатнымі джазавымі і блюзавымі музыкантамі: Томашам Шукальскім (з якім ён супрацоўнічаў на працягу многіх гадоў, ствараючы “Дуэт Шукальскі-Дуткевіч” і квартэт Томаша Шукальскага), а таксама з Уршуляй Дудзяк, Гражынай Аўгусцік, Дэборай Браўн, Лорай Шафран, Мішэлем Хэндрыксам, Карласам Джонсанам, Тадэвушам Налепай, Збігневам Намыслоўскім, Янам Пташынам-Урублеўскім, Ёргасам Сколіясам, Дарэкам Алешкевічам.

Зрабіў шматлікія запісы для польскага радыё і тэлебачання. Артур Дуткевіч - адзін з нешматлікіх джазавых піяністаў у Польшчы і Еўропе, які выконвае таксама музыку «імправізаваную сола».

Ён выступаў на буйных музычных фестывалях, сярод якіх: *Jazz Jamboree (*Варшава, Польшча), *Jazz Festival* (Мюнстэр, Германія), *Northsea Jazz Festival* (Гаага, Галандыя), *Jazz Festival (*Капенгаген, Данія), *Jazz Ost West* (Нюрнберг, Германія), *Music Oggi* (Мілан, Італія), *Festival D'Europe Centrale (*Парыж, Францыя), *Sziget Festival* (Будапешт, Венгрыя), *Jazz Festival* (Глазгоў, Шатландыя), *Jazz Rally (*Дзюсельдорф, Германія), а таксама ў шматлікіх канцэртных залах Еўропы, Азіі, Афрыкі і ЗША.

Ён запісаў шэсць аўтарскіх альбомаў: *”Блакітная сцежка”* - Артур Дуткевіч - *solo piano*, *“Lady Walking”* - Артур Дуткевіч - электронны канцэрт, "*Hendrix Piano” і ”Немэн-Імправізыцыі”* – Трыо Артура Дуткевіча, „Мазуркі” - Артур Дуткевіч - *solo piano,* „Prana” – Трыо Артура Дуткевіча і шмат іншых з рознымі выканаўцамі.

**www.arturdutkiewicz.pl**

**Арганізатары канцэртаў:**

**22.10.2014 г. – Мінск**

Беларуская дзяржаўная філармонія,
Польскі Інстытут у Мінску

**23.10.2014 г. – Васілішкі**

Польскі Інстытут у Мінску,
Шчучынскі райвыканкам,
Васілішкаўскі сельвыканкам,
Дом-музей Чэслава Немэна
ў Старых Васілішках,
Васілішкаўскі Цэнтр
культуры і вольнага часу

www.instpol.by